✓ «Дзень Буквара» з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, прысвечаны факсімільнаму ўзнаўленню першай беларускай кнігі для навучання грамаце, прайшоў у «Музеі-фабрыцы ёлачных цацак», які знаходзіцца ў гандлёвым цэнтры «Галерэя-Мінск». Галоўная кніжніца краіны падрыхтавала сапраўднае свята для навучэнцаў гімназіі № 1 г. Слуцка, Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў і сталічнай гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны. Госці змаглі наведаць выстаўку «Займальнае падарожжа па старонках буквароў розных часоў», дзе было прадстаўлена каля 30 буквароў і выданняў для пачатковага навучання чытанню і грамаце. Сярод іх — факсімільныя выданні і арыгіналы кніг XVI—XXI стагоддзяў. Цэнтральным экспанатам стаў юбіляр гэтага года — 400-гадовы «Букварь языка славенска писаний чтения учитися хотящим в полезное руковожение». Такім чынам, наведвальнікі выстаўкі змаглі пазнаёміцца з факсіміле кнігі, якая пачала новую сусветную традыцыю. А для дзяцей Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі падрыхтаваў тэматычныя заняткі. У творчай атмасферы хлопчыкі і дзяўчынкі даведаліся, як навучаліся грамаце ў старажытнасці, і паспрабавалі пісаць на... васковых таблічках.